ственность на землю, земля давалась без выкупа тем, кто ее обрабатывал. В пределах БНР все народы получали право на автономию, право пользоваться своим национальным языком [2]. 25 марта 1918 года была принята 3-я Уставная грамота, в которой БНР объявлялась «независимым и вольным государством», содержалось требование о пересмотре условий Брестского договора [2]. Первыми независимость БНР признали правительство Украинской Народной Республики и Литовская Тариба. Позднее Эстония, Чехословакия, Болгария и др. Однако, несмотря на все предпринятые руководством БНР шаги, не была признана ни Германией, ни Советской Россией.

Таким образом, вопрос об определении белорусской государственности так и не был решен. Причинами такого положения являлись неблагоприятная внешняя обстановка, разногласия по вопросу о формах государственности внутри самой Рады, неправильно выбранная тактика по отношению к оккупационным властям, оторванность Рады от прочих слоев населения.

По мере освобождения территории Беларуси Красной Армией правительство БНР из Минска переехало в Гродно, а затем и за пределы Беларуси.

Сложный противоречивый первый период возобновления белорусской государственности не завершился созданием самостоятельного государства. Провозглашенная БНР не имела признаков, свойственных самостоятельному и независимому государству, широкой поддержки со стороны народа и не была допущена к мирным переговорам в Бресте, где главные стороны — Германия и Советская Россия — решали вопрос и о территории Беларуси. Однако, как правильно отмечает профессор Т. И. Довнар [4], провозглашение БНР, активная деятельность Рады способствовали росту национального самосознания белорусского народа.

**Библиографический список**

1. Вішнеўскі, А. Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі / А. Ф. Вішнеўскі. — Мінск: Акадэмія МУС Рэспублікі Беларусь, 2003. — 319 с.

2. Вішнеўскі, А. Ф. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі ў дакументах і матэрыялах (са старажытных часоў да нашых дзен) / А. Ф. Вішнеўскі, Я. А. Юхо; пад агульн. рэд. праф. А. Ф. Вішнеўскага. — Мінск: Акадэмія МУС Рэспублікі Беларусь, 2003. — 320 с.

3. Кузнецов, И. Н. История государства и права Беларуси / И. Н. Кузнецов, В. А. Шелкопляс. — Минск: Тессей, 2004. — 318 с.

4. Доўнар, Т. І. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі / Т. І. Доўнар. — Мінск: ДІКСТ БДУ, 2011. — 552 с.

5. Юхо, Я. А. Гісторыя дзяржавы і права Беларусі: у 2 ч. / Я. А. Юхо. — Мінск: РІВШ БДУ, 2003. — Ч. 2. — 275 с.

**Кулевіч Інна Расціславаўна**

*Гродзенскі філіял «БІП–Інстытут правазнаўства» (Гродна, Беларусь)*

## ПЕРШЫ УСЕБЕЛАРУСКІ З'ЕЗД У ДАСЛЕДАВАННЯХ І. М. ІГНАЦЕНКІ

На мяжы 1950-х — пачатку 1960-х гг. з'явіліся новыя тэндэнцыі ў гістарычных даследаваннях. Гэта было звязана з правядзеннем XX з'езда КПСС. Узмацніўся акцэнт на навуковае вывучэнне гісторыі нацыянальных

рухаў і палітычных партый, праблем нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва, у тым ліку і беларускага нацыянальнага руху.

Першым даследчыкам, хто ўнёс новыя тэндэнцыі ў распрацоўку гісторыі беларускага руху, з'явіўся І. М. Ігнаценка. Менавіта ён у манаграфіі «Беднейшее крестьянство — союзник пролетариата в борьбе за победу Октябрьской революции в Белоруссии» [1] упершыню ахарактарызаваў сацыяльны і класавы састаў беларускіх нацыянальных партый, акрэсліў іх дзейнасць падчас падрыхтоўкі і правядзення Першага Усебеларускага з'езда. Аўтар вылучыў шэраг дагэтуль нявывучаных пытанняў, што патрабавалі асаблівай увагі, сярод якіх прычыны склікання, барацьба беларускіх партый паміж сабой, з аднаго боку, і з бальшавікамі, з другога.

У прыватнасці, засяродзіў пільную ўвагу на барацьбе бальшавікоў супраць партыі эсэраў за перацягненне на свой бок сялян. У выніку даследавання І. М. Ігнаценка зрабіў вывад, што большасць беларускіх нацыянальных партый не мела падтрымкі сярод сялянства.

З пачаткам перабудовы ў СССР, а пасля з яго распадам і абвяшчэннем нацыянальных суверэнітэтаў былых савецкіх рэспублік, у другой палове 1980-х гг., у айчыннай гістарыяграфіі па праблемах беларускага нацыянальнага руху наступіў новы і найбольш плённы этап.

Пальму першынства ў даследаванні гэтай тэматыкі ўтрымлівалі гісторыкі, якія пачалі ёю займацца яшчэ ў савецкія часы. Акрамя І. М. Ігнаценкі, гэта былі М. С. Сташкевіч, В. А. Круталевіч, У. Ф. Ладысеў, П. І. Брыгадзін. Якаснае адрозненне іх публікацый у параўнанні з мінулым перыядам заключалася ў памяркоўнасці поглядаў, стрыманасці ацэнак, адсутнасці рэзкіх суджэнняў і аднабаковых падыходаў. Увогуле, характэрная для іх аб'ектыўнасць станоўча паўплывала на характар даследаванняў.

Не выключэннем сталі і працы І. М. Ігнаценка. Яго даследаванні пачалі насіць абагульняльны і разважальны характар. Напрацаваны матэрыял дазволіў больш глыбока падыйсці да вывучэння Кастрычніцкай рэвалюцыі.

У манаграфіі «Октябрьская революция и самоопределение Белоруссии» [4] аўтар разглядае беларускі нацыянальны рух на фоне Кастрычніцкай рэвалюцыі. Ён задаецца пытаннем, чаму беларускія партыі не сталі альтэрнатывай партыі бальшавікоў, ці можна апошніх абвінавачваць ва ўзурпацыі і гвалтоўным захопе ўлады на Беларусі. Галоўнай прычынай слабасці беларускага нацыянальнага руху, на яго думку, паслужыла адсутнасць нацыянальнай буржуазіі. З ліку палітычных партый выдзялялася толькі БСГ, але і яна пасля расколу саступіла месца БПС-Р. Да таго ж партыя бальшавікоў на ¾ складалася з прадстаўнікоў не беларускай нацыянальнасці. Аўтар упэўнены, каб Беларусь не знаходзілася ў франтавой зоне, Кастрычніцкая рэвалюцыя тут не мела бы поспеху [4, с. 248].

Да таго ж сяляне, якія складалі большую частку беларускага грамадства, не жадалі адасаблення ад Расіі і аддавалі перавагу не нацыянальна-дзяржаўнаму, а сацыяльна-эканамічнаму самавызначэнню, да чаго магла прывесці толькі рэвалюцыя і бальшавікі. А галоўным пралікам беларускіх нацыяналістаў у гэтай справе лічыць супрацоўніцтва з акупантамі.

Гэтай жа тэматыцы прысвечана і яшчэ адна манаграфія І. М. Ігнаценка — «Кастрычніцкая рэвалюцыі на Беларусі: асаблівасці і вынікі» [2]. На падставе дакументаў, перыядычнага друку, мемуарнай і замежнай літаратуры

даследаваў спецыфіку Кастрычніцкай рэвалюцыі ва ўмовах Беларусі. На думку аўтара, да напісання сапраўднай гісторыі Кастрычніцкай рэвалюцыі яшчэ вельмі далёка. Нягледзячы на перабудову, «яна (рэвалюцыя) пазбаўлена былой, значна перабольшанай павагі і набыла таксама перабольшаную нянавісць» [2, с. 7].

У сваіх даследаваннях І. М. Ігнаценка разглядаў і нацыянальную палітыку бальшавікоў [3]. Апошнія, лічыць гісторык, упусцілі магчымасць устанаўлення саюза паміж партыямі, адзінства ў грамадстве. Гістарычная слабасць бальшавікоў, на яго думку, заключалася ў тым, што яны ніколі не ішлі на кампраміс, які разумеўся імі не як узаемныя ўступкі, а як уступкі толькі з аднаго боку — працілеглага. Яны дабіваліся, каб толькі іх думка мела права на жыццё. Вось гэта і прывяло, дарэчы, да гвалтоўнага роспуску Першага Усебеларускага з’езда.

І. М. Ігнаценка, які па-ранейшаму найбольш поўна даследаваў гэтую праблему, падставай склікання з’езда лічыў незавершанасць утварэння органаў Савецкай улады, а таксама няўдзел у гэтых працэсах прадстаўнікоў Віцебскай і Магілёўскай губерній [5, с. 234]. Ацэньваў Усебеларускі з’езд, зыходзячы з прынцыпу гістарызма і адхіляючы аднабаковыя падыходы.

Ён лічыў, што права нацый на самавызначэнне, якое дала Кастрычніцкая рэвалюцыя, зусім не павінна было адпавядаць сацыялістычнаму ладу ствараемых дзяржаў. У якасці доказу прыводзіў Польшчу і Фінляндыю, якія вызначыліся як буржуазна-дэмакратычныя, што не з’яўлялася рэгрэсам. Больш таго, для ўтварэння сацыялістычных краін не было яшчэ ні аб’ектыўных, ні суб’ектыўных умоў. Даследчык лічыў памылковым сцвярджэнне большасці гісторыкаў аб ігнараванні СНК нацыянальнага пытання.

Кіраўнікі Паўночна-Заходняга выканкама РСДРП(б) папросту адхілялі існаванне беларускай нацыі, а дзе няма асобнага народа, там не можа весціся пошук форм нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва. А рэалізацыя ленінскага плана самавызначэння беларускага народа была заўчаснай, што і даказаў ход Першага Усебеларускага з’езда і яго пастановы. Пытанне аб роспуску аўтар лічыць мала даследаваным і не знаходзіць правамоцных юрыдычных падстаў на гэты крок з боку СНК.

Такім чынам, І. М. Ігнаценка можна па праву лічыць пачынальнікам у навуковым вывучэнні Першага Усебеларускага з’езда, які разглядаў у рэчышчы Кастрычніцкай рэвалюцыі, нацыянальнай палітыкі бальшавікоў і дзейнасці беларускіх палітычных партый.

### Бібліяграфічны спіс


1. Игнатенко, И. М. Беднейшее крестьянство — союзник пролетариата в борьбе за победу Октябрьской революции в Белоруссии (1917—1918 гг.) / И. М. Игнатенко. — Минск: Издательство высш., сред. спец. и проф. образования БССР, 1962. — 498 с.

2. Игнатенко, И. М. Великий Октябрь в судьбах белорусского народа / И. М. Игнатенко. — Минск: Беларусь, 1987. — 319 с.

3. Ігнаценка, І. М. Кастрычніцкая рэвалюцыя на Беларусі: асаблівасці і вынікі / І. М. Ігнаценка. — Мінск: БелНДЦДААС, 1995. — 271 с.

4. Игнатенко, И. М. Октябрьская революция и самоопределение Белоруссии / И. М. Игнатенко. — Минск: Навука і тэхніка, 1992. — 254 с.

5. Игнатенко, И. М. Февральская буржуазно–демократическая революция в Белоруссии / И. М. Игнатенко. — Минск: Наука и техника, 1986. — 344 с.